

Фіялка і падснежнік

Аўтар: Анна Віткоўская
08.02.2013 01:00



“Любоў доўгацярплівая, любоў ласкавая, не зайздросціць, любоў не пыхлівая, не ганарыцца, не бессаромная, не шукае свайго, не гневаецца, не памятае зла, не радуецца несправядлівасці, але радуецца разам з праўдай. Усё зносіць, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё церпіць” (1 Кар 13, 4-7). Прайшла зіма. Яшчэ дзе-нідзе заставаўся ляжаць снег, а сярод маладой травы ўжо сталі з’яўляцца першыя кветкі. Побач з белым падснежнікам з’явіўся маленькі парастак. Ён рос з кожным днём усё вышэй і вышэй, пакуль не ператварыўся ў прыгожую фіялетавую кветачку. Гэта была фіялка. Прачнуўшыся, яна раскрыла свае пялёсткі і стала са здзіўленнем і захапленнем аглядацца. Спачатку яна ўбачыла далікатна-блакітнае неба з белымі аблокамі. Потым доўга глядзела на цёплае яркае сонца, якое лашчыла сваімі промнямі ўсё навокал. І раптам побач з сабой яна заўважыла цудоўную белую кветку.

– Як цябе завуць? – спытала яна свайго суседа. †



Падснежнік павярнуў свае пялёсткі. Ён убачыў фіялку і быў здзіўлены яе прыгажосцю.

– Я падснежнік, – адказаў ён, – ты такая прыгожая, давай сябраваць!

– Давай! – пагадзілася фіялка. І з гэтай хвіліны яны сталі неразлучнымі сябрамі.

Кожны дзень зараз для іх абодвух быў радасным і шчаслівым. Падснежнік і фіялка часта расказвалі адзін аднаму розныя гісторыі, любілі разам піць кроплі дажджу і падоўгу дыхалі цёплым веснавым паветрам. Па начах, калі станавілася холадна, падснежнік затуляў фіялку травінкамі і імкнуўся сагрэць яе сваімі лісточкамі. А фіялка адорвала сябра сваім далікатным водарам.

Але аднойчы раніцай, калі сонца яшчэ не паспела ўзысці і абудзіць кветкі, адбылася адна непрыемная гісторыя. Фіялка прачнулася ад нейкага незразумелага шолаху. Побач з падснежнікам яна ўбачыла вялікую пражэрлівую гусеніцу, якая павольна падпаўзала да яго лістоў, каб імі паласавацца.

– Што ж мне рабіць, – думала фіялка. Не ведаючы, чым дапамагчы свайму сябру, яна моцна хвалявалася.

І раптам яна, узрадаваўшыся, нахілілася да гусеніцы і хутка працягнула ёй насустрач свае лісточкі. Было вельмі балюча, але фіялка цярпела. Яна нават і не спрабавала адхіліць пялёсткі, а марыла толькі пра тое, каб гусеніца хутчэй наелася і не чапала яе сябра.

Калі падснежнік прачнуўся, гусеніцы ўжо не было. Ён павярнуўся да фіялкі і раптам з жахам убачыў, што ў яе не стала двух фіялетавых пялёсткаў, а ўсё яе лісце напалову з'едзена.

– Якая ж ты брыдкая і непрыгожая! Ты, напэўна, захварэла, – прашамацеў падснежнік. – Мне больш зусім не хочацца з табой сябраваць. Ён больш не звяртаў увагі на фіялку і паспрабаваў хутчэй пра яе забыцца.

Фіялка нічога не адказала. Паглядзеўшы на рэшткі свайго лісця, яна толькі горка заплакала. Дзіўна, але фіялка зусім не пакрыўдзілася на свайго сябра. Ён па-ранейшаму быў для яе самым лепшым на свеце.

– Хай лепш ён не ведае, што здарылася, – думала яна, – навошта я буду псаваць яму настрой сваім выглядам.

Зараз фіялка імкнулася расці непрыкметна побач і не напамінаць пра сябе. Яна толькі моўчкі глядзела з травы на свайго любімага сябра. Кожны раз, калі падснежнік паварочваўся ў яе бок, яна, каб не спалохаць яго, хутчэй нахілялася і хавалася сярод травы.

Неяк раз на палянцы з'явілася маленькая дзяўчынка, якая збірала букет. Падснежнік і ўсе астатнія кветкі сталі хавацца ад дзяўчынкі ў траве і прыціскацца да зямлі. Не хавалася толькі адна фіялка. Яна наадварот моцна выцягнулася ўгару і як мага шырэй раскрыла свае апошнія пялёсткі, закрываючы сабою свайго сябра.

– Не зрывай майго сябра, – што ёсць моцы шамацела фіялка, – сарві лепш мяне.

Дзяўчынка, напяваючы песню, мінула. Усе кветкі зноў прыпаднялiся да сонца, а фіялка тут жа схавалася ад падснежніка і зноў стала непрыкметнай.

Праз некалькі дзён да падснежніка прыляцеў прыгожы матылёк, ён сеў побач з падснежнікам і расказаў яму сваю гісторыю:

– Я лётаю і шукаю адну фіялку, каб папрасіць у яе прабачэння, – сказаў ён. – Раней, калі я быў яшчэ гусеніцай, гэтая фіялка дзеля свайго сябра падснежніка ахвяравала сваё лісце і ім накарміла мяне. Ці не сустракаў ты, падснежнік, фіялку з аб'едзенымі лісточкамі і без двух пялёсткаў.

Толькі цяпер падснежнік зразумеў, што фіялка аддала сваё лісце і сваю прыгажосць для таго, каб выратаваць яго ад гусеніцы.

– Гэтую фіялку я ведаю, яна тут, побач, хаваецца ў траве, – радасна ўсклікнуў падснежнік.

Ён паклікаў фіялку, але яна не выглянула з травы. Падснежнік паклікаў яе яшчэ раз, але яна не адгукалася. Заляцеўшы ў траву, матылёк убачыў засохлую фіялку амаль без пялёсткаў, якая ляжала на зямлі. Дапамагчы ёй было ўжо немагчыма.

Многа дзён плакаў падснежнік. Велізарны цяжар быў у яго на сэрцы, і пачуццё віны не

пакідала яго яшчэ вельмі доўга. Але аднойчы падснежнік адчуў, што хтосьці яго далікатна гладзіць і супакойвае. Ён аглянуўся і ўбачыў побач з сабой прыгожую страказу з фіялетавымі крылцамі. Ён пазнаў у ёй фіялку.

– Не плач, я зусім не крыўджуся на цябе, – сказала страказа. – Бачыш, я зноў жыву, давай сябраваць?

З тых часоў шматлікія кветкі дзівіліся незвычайнай страказе з фіялетавымі крылцамі, якая чамусьці нікуды не адлятала ад самага звычайнай белага падснежніка. Травінкі нават пасмейваліся над недарэчнай страказой, якая нават у спякоту не хавалася, як усе, у цень, а клапатліва абмахвала падснежнік сваімі цудоўнымі фіялетавымі крылцамі.

Калі вецер пачуў гэтую гісторыю, ён раззлаваўся на траву, якая здзекавалася над страказой і падснежнікам. Калі ён пралятаў над травой, то прымяў яе трохі і прашаптаў:

– Цішэй ты, бессардэчная, цішэй! Яны кахаюць адзін аднаго. Толькі сапраўднае каханне здольна да такой ахвяры.